І. А. Прэзаў

# ІНТЭРВЕНЦЫЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У РАСІЮ Ў ПАЧАТКУ XVII СТ.

*Разглядаюцца малавядомыя падзеі гісторыі Беларусі, звязаныя з інтэрвенцыяй Рэчы Паспалітай у Расію ў пачатку XVII ст.*

Пасля смерці Стэфана Баторыя на трон Рэчы Паспалітай быў абраны шведскі прынц Жыгімонт Ваза (1587 – 1632), які выбраў новую тактыку ўплыву на Маскоўскую дзяржаву. У гэты час у Расіі пачынаецца "смутны час", які быў выкліканы рэзкім абвастрэннем сацыяльных супярэчнасцей і пагаршэннем эканамічнага становішча ў выніку войнаў і апрычніны. Становішча ўскладнілася дынастычным крызісам, які быў звязаны са смерцю апошняга прадстаўніка дынастыі Рурыкавічаў Фёдара Іванавіча (1584 – 1598) і ўступленнем на трон Барыса Гадунова. (1598 – 1605). Жыгімонт Ваза імкнуўся падтрымаць сваіх стаўленнікаў на рускі прастол, авантурыстаў дакладна невысветленага паходжання, якія выдавалі сябе за Дзмітрыя – забітага ў 1591 г. малодшага сына цара Івана IV. Ілжэдзмітрыю I (1605 – 1606) пры падтрымцы польскай, літоўскай, беларускай і ўкраінскай шляхты ўдалося заняць Маскву. Ён быў прызнаны маскоўскім баярствам, вянчаўся на царства 21 ліпеня 1605 г., аднак у выніку народнага паўстання быў забіты ў 1606 г. Улада абранага баярамі цара Васіля Шуйскага (1606 – 1610) была няўстойлівай. Яму давялося пайсці на сур'ёзныя саступкі дваранству. У Расіі ўзмацніліся цэнтрабежныя тэндэнцыі, праявай якіх стала паўстанне пад кіраўніцтвам Івана Балотнікава (1606 – 1607), які выдаваў сябе за "ваяводу царэвіча Дзмітрыя". У 1607 г. аб'явіўся яшчэ адзін самазванец Ілжэдзмітрый II ("Тушынскі злодзей") (1607 – 1610), якога падтрымалі магнаты Рэчы Паспалітай і кароль Жыгімонт Ваза. Аднак, нягледзячы на тое, што Ілжэдзмітрый II кантраляваў значную частку Расіі, ён так і не змог увайсці ў расійскую сталіцу. План Жыгімонта Вазы меў характар прыватнай ініцыятывы і не атрымаў шырокай падтрымкі шляхты. Магнаты таксама даволі хутка страцілі інтарэс да гэтай авантуры. Пасля таго як план фактычна праваліўся, пачалася прамая інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Расійскую дзяржаву (1609 – 1618). Фармальнай прычынай вайны Жыімонт Ваза назваў заключаны ў лютым 1609 г. руска-шведскі саюз, які быў накіраваны і супраць яго ўласна. Рускае войска пацярпела паражэнне. У ходзе кампаній 1609 – 1612 гг. войскамі Рэчы Паспалітай была акупавана значная частка тэрыторыі Расіі, у т.л. быў захоплены г. Смаленск. Пасля таго як сілы Рэчы Паспалітай разбілі ў бітве ля Клушына летам 1610 г. руска-шведскае войска, цар Васіль Шуйскі быў скінуты і быў утворыны часовы баярскі ўрад – Сямібаяршчына, які рускім царом 17 жніўня 1610 г. абраў сына Жыгімонта Вазы – 15-гадовага Уладзіслава. Аднак уваход у Маскву войска Рэчы Паспалітай выклікаў шырокае незадавальненне расійскага грамадства. У 1611 г. было арганізавана першае народнае апалчэнне на чале з П. Ляпуновым, а ў 1612 г. – другое пад кіраўніцтвам К. Мініна і Дз. Пажарскага. Пасля працяглай асады Масквы войска Рэчы Паспалітай у 1612 г. пакінула горад. У студзені 1613 г. Земскі сабор абраў царом 16-гадовага Міхаіла Раманава, сына патрыярха Філарэта, які быў сваяком першай жонкі Івана Грознага. Новыя спробы Уладзіслава заняць расійскую сталіцу ў 1617 – 1618 гг. скончыліся безвынікова. У снежні 1618 г. было заключана перамір'е на 14,5 гадоў у в. Дэўліна, паводле якога да Рэчы Паспалітай адышлі амаль усе Ноўгарад-Северская, Чарнігаўская і Смаленская землі. Паводле ўмоў перамір'я быў праведзены абмен палоннымі, сярод якіх быў бацька цара Міхаіла Фёдаравіча мітрапаліт Філарэт, а каралевіч Уладзілаў не адмовіўся ад прэтэнзій на расійскі трон. Такім чынам, Дэўлінскае перамір'е стала буйнейшым поспехам Рэчы Паспалітай ў барацьбе з Расійскай дзяржавай. Аднак недавырашанасць канфлікту прывяла ў далейшым да войн Расіі з Рэччу Паспалітай 1632 – 1634 гг. і 1654 – 1667 гг.

### *Спіс літаратуры*

1. Смутное время [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A1 %D0%BC%D1%83%D1%82%D0%BD%D0%BE %D0%B5_%D0%B2%D1%80%D0% B5%D0%BC %D1%8F. – Дата доступа: 29.03.2018.
2. Смутное время в истории России [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://historykratko.com/smutnoe-vremya- smuta. – Дата доступа: 29.03.2018.
3. Смутное время [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://histrf.ru/lenta-vremeni/event/view/smuta. – Дата доступа: 29.03.2018.

*Презов Иван Александрович,* студент ФИТиУ БГУИР, prezov.ivan@gmail.com
*Научный руководитель: Николаева Людмила Викторовна,* зав.кафедрой гуманитарных дисциплин, к. и. н., доцент.